УДК 379.83:39(476.6)

# ЭТНАГРАФІЧНЫ РЭГІЁН ПАНЯМОННЯ ЯК ПРЫКЛАД ТУРЫСЦКАЙ ДЭСТЫНАЦЫІ

***А.А. Русакова**, 4 курс*
*Навуковы кіраўнік – **У.А. Жылко**, к.культ.н.*
***Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы***

Кожная тэрыторыя мае свае асаблівасці, свой турыстычны патэнцыял і гісторыю. Турысцкая дэстынацыя – гэта геаграфічная прастора (мясцовасць, рэгіён, краіна), якая складае мэту падарожжаў наведвальніка, якая валодае неабходнай інфраструктурай для размяшчэння, харчавання, забаў, пазнавальнай і аздараўленчай дзейнасці, якая з'яўляецца суб'ектам канкурэнцыі на рынку турызму і стратэгічным аб'ектам прадпрымальніцтва. Звяртаючыся да даследавання турысцкай дэстынацыі Беларусі, у якасці асноўнага крытэрыя вылучэння пэўнай тэрыторыі можна спыніць увагу на этнаграфічным рэгіёне.

Гісторыка-этнаграфічны рэгіён вылучаецца на якой-небудзь тэрыторыі паводле комплексу этнакультурных прыкмет: асаблівасцей этнічнай гісторыі, характару рассялення, гаспадарчых заняткаў і прылад працы, народнай архітэктуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, традыцыйнага адзення, фальклору, мясцовых гаворак і інш. Арэальнае (этнаграфічнае) вывучэнне і картаграфаванне разнастайных кампанентаў тэрыторыі Беларусі ў XVIII–XIX стст. дазваляе суаднесці іх на

розных таксанамічных узроўнях і вылучыць у Беларусі шэсць этнаграфічных рэгіёнаў: Паўночны (Паазер'е), Усходні (Падняпроўе), Цэнтральны (Цэнтральная Беларусь), Паўночна-Заходні (Панямонне), Усходняе Палессе і Заходняе Палессе.

Панямонне – гісторыка-этнаграфічны рэгіён Беларусі, які займае тэрыторыю Гродзенскай і сумежных частак Брэсцкай і Мінскай абласцей. На поўдні мяжуе з Заходнім Палессем (па вярхоўях рэк Нараў і Ясельда да г. Бяроза і Івацэвічы), на ўсходзе і паўночным усходзе – адпаведна цэнтральнай Беларуссю і Паазер'ем (на захад ад г.Баранавічы па Налібоцкай пушчы, да г. Маладзечна, Мядзел, Паставы) [2].

Панямонне – гэта паўночна-заходні рэгіён, які лакалізуецца ў басейне ракі Нёман і ў асноўным адпавядае Гродзенскай вобласці. Цікава адзначыць, што ў складанні этнакультурнага аблічча Панямоння ўдзельнічалі славянскія і балцкія кампаненты. Гістарычна дадзены рэгіён называўся Літвой, а мясцовыя жыхары – ліцвінамі. Панямонне – традыцыйна каталіцкая вобласць краіны, абавязковым элементам ландшафту якой з'яўляюцца вежы старадаўніх касцёлаў і сярэднявечных замкаў. Усё гэта абумовіла шэраг этнакультурных асаблівасцяў, якія вылучаюць гэты край з шэрагу іншых. Цэнтрам рэгіёну з'яўляецца Гродна – класічны еўрапейскі горад, у архітэктуры якога праглядаецца шэраг стыляў ад готыкі да мадэрна.

У асабліва ахоўнай зоне ЮНЕСКА размешчаны Аўгустоўскі канал, які злучае рэкі Віслу і Нёман. Гэта помнік гідратэхнічнага дойлідства XIX ст. з шэрагам шлюзаў і разводных мастоў. Падарожнічаць па канале турысты могуць на прагулачных катэрах, байдарках, каноэ і маторных лодках. Мяжой паміж Панямоннем і Цэнтральным рэгіёнам служыць буйны лясны масіў – Налібоцкая пушча.

Можна казаць, што Гродзенская вобласць вылучаецца сярод іншых рэгіёнаў Беларусі высокай канцэнтрацыяй каштоўных аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, уключаючы памятныя мясціны значных гістарычных падзей, унікальныя архітэктурныя помнікі розных стыляў, мемарыяльныя месцы, звязаныя з жыццем выдатных дзеячаў гісторыі і культуры. Значная частка багатага гісторыка-культурнага патэнцыялу Гродзенскай вобласці знаходзіцца ў шматлікіх малых і сярэдніх гістарычных гарадах рэгіёну. Такімі маленькімі, але багатымі на гісторыю і культуру могуць паслужыць беларускія мястэчкі.

На тэрыторыі Панямоння налічваецца вялікая колькасць мястэчак (Гальшаны, Мір, Іўе, Жыровічы, Ружаны, Індура, Адэльск, Свяцк, Жалудок і яшчэ вялікая колькасць). Усе яны валодаюць вялікім гісторыка-культурным патэнцыялам для развіцця турызму ў этнаграфічным рэгіёне Панямоння.

Гальшаны – мястэчка ў Ашмянскім раёне Гродзенскай вобласці. Сталіца беларускіх прывідаў, авеяная дзесяткамі легенд, ушанаваных у бессмяротным творы У. Караткевіча "Чорны замак Альшанскі". На жаль, залаты век гэтага мястэчка сышоў, пакінуўшы падарожнікам руіны замка, касцёл з кляштарам і многае іншае.

Мір – мястэчка ў Карэліцкім раёне Гродзенскай вобласці, у якім знаходзіцца адзін з самых прыгожых замкаў Усходняй Еўропы. Замак, рынкавы пляц з касцёлам XVI ст., габрэйскі квартал з некалькімі сінагогамі – тое самае месца, каб адчуць дух сапраўднага мястэчка.

Ружаны – мястэчка ў Пружанскім раёне Брэсцкай вобласці. Беларускі версаль, рэзідэнцыя магнатаў Сапегаў, прыраўнаваных да каралёў. Акрамя пышнага палаца, пра гісторыю мястэчка раскажуць сінагогі, касцёл і царква, якія знаходзяцца на рынкавай плошчы [3].

Жалудок – мястэчка ў Шчучынскім раёне Гродзенскай вобласці. Мястэчка, якое падаравала нам аднаго з самых яркіх прадстаўнікоў імпрэсіянізму пачатку XX ст., імя якому – Пінхус Крэмень. Жалудок – адзін з нямногіх прыкладаў барочнай планіроўкі, якая ў Беларусі практычна не сустракаецца. Дарэчы, тут жа знаходзіцца выдатная сядзіба і адзін з самых прыгожых касцёлаў у стылі класіцызм [3].

Жыровічы – мястэчка ў Слонімскім раёне Гродзенскай вобласці. Асноўнай Жыровіч з'яўляецца комплекс будынкаў мужчынскага Свята-Успенскага праваслаўнага манастыра, які быў заснаваны тут ў 1470 г. У наш час на тэрыторыі манастыра размешчана таксама адна з буйнейшых у Беларусі семінарый. Манастыр у вёсцы Жыровічы з'яўляецца адным з найбольш наведвальных і шанаваных манастыроў ўсёй Беларусі. У гэтым манастыры, у галоўным Свята-Успенскім саборы захоўваецца святая цудатворны Жыровіцкі абраз Маці Божай. Паводле падання, гэты абраз цудоўным чынам выявілася на камені. Адбылося гэта на тым месцы дзе зараз і размешчаны манастыр.

Невялікае мястэчка Іўе можна назваць сімвалам традыцыйнай беларускай мультканфесійнасці і талерантнасці. Здаўна тут суседнічалі каталікі, габрэі, мусульмане і праваслаўныя. У горадзе зарэгістравана больш за дзесятак розных рэлігійных суполак, некаторыя вернікі нават называюць

Репозиторий ПолесГУ

Іўе «маленькім Іерусалімам». Каталіцкую веру ўяўляе касцёл Святых Пятра і Паўла, пабудаваны яшчэ ў XV ст. Перад будынкам ўсталяваная скульптура Ісуса Хрыста з раскінутымі рукамі, дакладная копія статуі ў Рыа-дэ-Жанейра. Статуя Хрыста відаць з любой кропкі горада.Габрэйскае насельніцтва да пачатку Вялікай Айчыннай вайны складала больш за 70% жыхароў горада. Будынак галоўнай сінагогі цудам ацалеў, але не выкарыстоўваецца па прамым прызначэнні. Мусульманства – самая старажытная рэлігія на тэрыторыі Іўя. Тут размешчана другая па велічыні пасля Мінска татарская абшчына. Мячэць, пабудаваная ў 1882 г., дзейнічае да нашага часу. Праваслаўе – самая маладая рэлігія ў Іўі. Царква ў імя свяшчэннапакутніка, немаўля Гаўрыіла пачала працу толькі ў 1995 г. Прадстаўнікі чатырох рэлігій жывуць як добрыя суседзі, помнік канфесіям заклікана падкрэсліць магчымасць вольнага веравызнання і мірнага суіснавання людзей [1]. Самае важнае гістарычнае значэнне мястэчак у тым, што гэтыя паселішчы з’яўляліся прыкладам “сужыцця” ў згодзе пад “адным дахам” розных этнасаў, вер, моў і культур, своеасаблівай кантактнай зонай паміж імі.

У цяперашні час, у сувязі з завяршэннем будаўніцтва аграгарадкоў (частка іх прымеркавана да былых мястэчках), з рэалізацыяй праграмы па аграэкасядзібах, удасканаленнем турыстычнай інфраструктуры, значна змяняецца аблічча краіны. З'яўленне новых рэкрэацыйных зон, аднаўленне гісторыка-культурных аб'ектаў, асаблівая ўвага ўрада і рэгіянальных адміністрацый да праблем развіцця мясцовага турызму могуць прывесці да мерапрыемстваў, якія змогуць даць “другое жыццё” былым мястэчкам Беларусі ў ранейшым іх статусе. Суседняя Літва аднавіла назву тыпу селішча – "мястэчка". Гэта можна зрабіць і ў Беларусі. Гэтыя самыя мястэчкі будуць месцамі для арганізацыі культурна-пазнавальнага, кульурна-гістарычнага, рэлігійнага, настальгічнага турызма.

Сёння Панямонне можа стаць сапраўды прывабным напрамкам у Беларусі. Для больш дынамічнага развіцця турыстычнай сферы рэгіёну неабходна абсталяваць інфармацыйнымі стэндамі і знакамі аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны, абсталяваць турысцка-інфармацыйныя цэнтры рэкламна-інфармацыйнымі матэрыяламі на беларускай і англійскай мовах, забяспечыць аналагічнай прадукцыяй аб'екты прыдарожнага сэрвісу, гасцініцы. Неабходна таксама актывізаваць удзел у міжнародных, трансгранічных праграмах, выкарыстаць патэнцыял розных відаў турызму і прасунуць Панямонне на больш шырокі турыстычны рынак.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Памятник четырем конфессиям в Ивье [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://probelarus.by/. – Дата доступа: 04.03.2019.

2. Панямонне [Электронный ресурс] – Режим доступа : http:// http://www.gants-region.info/. – Дата доступа: 12.03.2019.

3. Прогулка по городам Понёманья [Электронный ресурс] – Режим доступа :http://belarus.travel/. – Дата доступа: 12.03.2019.